# На тым тыдні...

✓18 сакавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшлі **мерапрыемствы, прысвечаныя 75-годдзю вызвалення вязняў Азарыцкага лагера смерці**. Да іх арганізацыі спрычыніліся Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Ёханеса Рау, міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Узаемапаразуменне».

«Азарычы» – комплекс нямецкіх канцэнтрацыйных лагераў, вядомы таксама як Азарыцкі лагер смерці. У сакавіку 1944 г. непадалёк сельскіх населеных пунктаў Азарычы, Дзерць і Падасіннік 9-я армія вермахта арганізавала тры часовыя лагеры. Агароджаныя дротам канвееры смерці былі створаныя для таго, каб пазбавіцца ад інфекцыйных хворых, калек, старых, жанчынаў, якія мелі больш за двое дзяцей, малодшых за 10 гадоў дзяцей і іншых, каго вермахт лічыў непрацаздольнымі. Да вызвалення вязняў 65-й арміяй 1-га Беларускага фронту тут загінула ад 9 000 да 13 000 чалавек, якія былі выračаныя на марудную смерць пад адкрытым небам ад тыфу, голаду і холаду.




*Вязні Азарыцкага лагера*

✓19 сакавіка ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў Мінску адкрылася **сумесная выстаўка «Вместе»** Андрэя Мацвеюка і яго дачкі Паліны Мацвеюк. На ёй прадстаўленыя жывапісныя працы, выкананыя алеем і акварэллю, – шматлікія нацюрморты, пейзажы і партрэты. Іх агульная тэматыка адлюстроўвае ўнутраны свет аўтараў, паўсядзённыя ўражанні і развагі. Некаторыя з прадстаўленых карцінаў А. Мацвеюка былі напісаныя яшчэ ў яго школьныя гады.

✓19 сакавіка ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася **выстаўка жывапісных працаў «Мир детскими красками»**, прысвечаная 60-годдзю дзіцячай мастацкай школы № 1 імя В.К. Цвіркі ў Мінску. Прадстаўленая экспазіцыя – вынік атмасферы творчага натхнення, матывацыі і ўдасканальвання вучэбнага працэсу, якія падтрымліваюцца і развіваюцца выкладчыкамі дзіцячай мастацкай школы.



*Украінская і беларуская лялькі (пач. XX ст.)*

✓19 сакавіка ў Дзіцячым цэнтры Расійскага этнаграфічнага музея ў Санкт-Пецярбургу адбылася **лекцыя «Лялька ў традыцыйнай культуры ўкраінцаў і беларусаў»**, якую чытала навуковы супрацоўнік аддзела этнаграфіі народаў Беларусі, Украіны і Малдовы РЭМ Алена Дзякава.

У Расійскім этнаграфічным музеі захоўваецца ўнікальны збор традыцыйных украінскіх і беларускіх лялек, большасць з якіх была зробленая ў першай трэці XX стагоддзя. Пад час лекцыі можна было атрымаць інфармацыю пра тыпалагічныя і канструктыўныя асаблівасці лялек са збораў музея, даведацца пра ляльку як сімвалічнае падабенства чалавека ў дзіцячых гульнях ды інш.

✓21 сакавіка Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа запрашаў паўдзельнічаць у **літаратурным свяце «Сусветная мудрасць у паэзіі»**, прымеркаваным да Сусветнага дня паэзіі, які адзначаецца ў гэты дзень з 1999 г. па ініцыятыве ЮНЕСКА. Паэзія можа стаць адказам на самыя вострыя і глыбокія духоўныя пытанні сучаснага чалавека, лічаць супрацоўнікі музея, таму свята ўжо стала традыцыйным у Доме Коласа.

✓21 сакавіка ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча ў Мінску адзначылі **Сусветны дзень паэзіі**. Адказы па пытанні «што ёсць паэзія?», «чым ёсць паэзія?», «дзе ёсць паэзія?» можна было адшукаць у кампаніі беларускіх паэтаў і паэтак Крысціны Бандурынай, Георгія Барташа, Артура Камароўскага, Стася Карпава, Марыі Мартысевіч ды іншых.

✓З 26 па 29 сакавіка Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа запрашаў далучыцца да **абрадавага свята «Вясна, вясна жаданая!»**. Ахвочыя маглі наведаць майстар-класы па вырабе вясновых паштовак, арыгінальных букетаў з цукерак, духмянага мыла, птушак з саломы, паўдзельнічаць у традыцыйным літаратурна-фальклорным свяце «Гуканне вясны», убачыць прыклады майстэрства саломапляцення на часовай выстаўцы «Светлыя мары вясны».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ